Паважаныя калегі!

**ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ**
**ДЗЯТЛАЎСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ**

запрашаюць прыняць удзел у навукова-практычнай канферэнцыі

# ДЗЯТЛАВА І ДЗЯТЛАЎСКІ КРАЙ: ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА

## (да 575-годдзя горада)

Плануемае праблемнае поле канферэнцыі:

- Дзятлаўскі край у святле археалагічных крыніц;
- гісторыя і культура Дзятлаўскага рэгіёна;
- Дзятлава ў гады Вялікай Айчыннай вайны;
- выбітныя ўраджэнцы Дзятлаўскай зямлі;
- асаблівасці развіцця мястэчак Беларускага Панямоння;
- праблемы этна-канфесійнай гісторыі Дзятлаўшчыны;
- сядзібныя і паркавыя комплексы;
- турыстычны і этнаграфічны патэнцыял краю;
- першы крок у навуку.

Час правядзення канферэнцыі: **12 верасня 2025 г.**

Плануемае месца правядзення канферэнцыі: **г. Дзятлава, Гродзенская вобл.**

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі прымаюцца да **12 жніўня 2025 г.** на электронную пошту **rogneda_o@mail.ru**.

У заяўцы паведамляецца імя, імя па бацьку і прозвішча дакладчыка; яго вучоная ступень і званне; пасада і назва ўстановы, якую прадстаўляе дакладчык; назва даклада; кантактны тэлефон і e-mail. Студэнтам, магістрантам і аспірантам разам з заяўкай неабходна даслаць тэзісы даклада (да 2000 знакаў) і водгук навуковага кіраўніка.

Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для выступлення і публікацыі. Пацвярджэнне аб удзеле ў канферэнцыі будзе даслана да **26 жніўня 2025 г.**

**Форма ўдзелу ў канферэнцыі:** вочная.

Матэрыялы канферэнцыі будуць апублікаваны. Патрабаванні да тэкстаў дакладаў: да **15 лістапада 2025 г.** у аргкамітэт дасылаецца электронны варыянт не болей за 30 000 знакаў. Спасылкі пастаронкавыя, нумарацыя на кожнай старонцы. Першая спасылка на публікацыю даецца цалкам (аўтар, назва, месца і год выдання, старонкі), у наступнай спасылцы месца і год выдання апускаюцца.

Рабочыя мовы канферэнцыі: беларуская, руская, англійская.

**Кантакты:** Рагнеда Анатольеўна Аляхновіч, 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Тэл. (+375 17) 378-18-95, факс (+375 17) 379-18-34, e-mail: rogneda_o@mail.ru.

Трансфер па маршруце Мінск – Дзятлава – Мінск ажыццяўляецца арганізатарамі канферэнцыі, даезд з іншых населеных пунктаў за кошт камандзіруючага боку.

Аргкамітэт